# Парадак марфалагічнага разбору часціцы

1. Часціна мовы.
2. Простыя ці састаўныя.
3. Разрад паводле значэння: сэнсавыя (указальныя, выдзяляльна-абмежавальныя), мадальныя (сцвярджальныя, адмоўныя, пытальныя, пабуджальныя), эмацыянальныя (клічныя, узмацняльныя) ці формаўтваральныя.
4. Роля часціц (выражаюць абмежаванне, пажаданне, сцвярджэнне, пытанне, пачуцці ці служаць для ўтварэння форм слова).

# Узоры выканання марфалагічнага разбору часціцы

***Маленства! Як бясконца дорага яно кожнаму!***

**1. Як — часціца.**

**2. Простая.**

**3. Эмацыянальная (клічная).**

**4. Выражае захапленне.**

**Няхай жывуць непарушнае інтэрнацыянальнае адзінства і брацкая дружба народаў!**

**1. Няхай — часціца.**

**2. Простая.**

**3. Мадальная (пабуджальная).**

4. Служыць для ўтварэння формы дзеяслова 3-й асобы загаднага ладу.